Стыль

«Рэдкі мужчына можа правільна камбінаваць рэчы»

Чаму беларусаў складана апрануць па модзе

Людміла ТАРАКАНАВА — вядомы мадэльер, дацэнт кафедры дызайну і моды ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, удзельніца модных паказаў і выставак лёгкай прамысловасці ў Дзюсельдорфе, Кёльне, Калінінградзе, Маскве, Львове, Лодзі і іншых гарадах. Віцебскі дызайнер адзення стварыла некалькі дзясяткаў унікальных калекцый, поспехам адзначаны яе неаднаразовыя паказы аўтарскіх калекцый на Беларускім тыдні моды ў Мінску. Мадэлі Тараканавай апублікаваныя ў часопісах моды і стылю — італьянскім Collezioni, расійскім Fashion Collection і некаторых іншых. Мадэльер расказала карэспандэнту «Звязды» пра асноўныя тэндэнцыі мужчынскай моды будучага сезону і пра тое, як можна развіць пачуццё стылю ў нашага дужага полу.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

— На самай справе пачуццё стылю цесна звязана з пачуццём колеру. У многіх маіх студэнтаў бачна прыроджанае пачуццё стылю, яны нібыта інтуітыўна працуюць з тканінай і колерам. Але я ўпэўнена, што гэта пачуццё можна і развіць. Бацькі могуць аддаць сваё дзіця ў мастацкую школу ці нейкі гурток па выяўленчым мастацтве. Справа ў тым, што там малых знаёмяць з колеравай гармоніяй, што існуе ў свеце, і творамі вялікіх людзей і такім чынам прывіваюць густ. Даросламу чалавеку таксама можна развіць пачуццё стылю, калі ён з дапамогай інтэрнэту, спецыяльнай літаратуры і прафесіяналаў возьмецца за самаадукацыю ў гэтым кірунку.

А жанчына можа адразу вылучыць у камплекце для сябе, напрыклад, спадніцу і ўявіць, з чым яна магла б скамплектаваць яе, падабраць абутак і аксесуары, каб падаць вобраз пановаму. Для жанчыны важныя і крой, і колер, і дэкор. Калі ж трэнды састарэлі, то ад жанчыны можна пачуць фразу: «Мне няма чаго надзець».

Гэта ўсё датычыцца, бадай што, нашага рэгіёна. Калі казаць, напрыклад, пра ўсходнія краіны, дзе захоўваюцца традыцыі, то акцэнты ў модзе змяшчаюцца на якасць тканіны і дэкор. А вось у амерыканцаў важная функцыянальнасць адзення, каб было зручна насіць. Канешне, мне як дызайнеру хочацца верыць, што працэнт людзей, якія будуць сачыць за тэндэнцыямі ў модзе, павялічыцца, а нашы мужчыны змогуць дакладна вызначыць сваю рэч, якая будзе пасаваць і характару, і атачэнню.



— Вам прынеслі вядомасць калекцыі мужчынскага адзення. Напэўна, вы ўлавілі, чым адрозніваецца ўспрыманне моды мужчынамі і жанчынамі?

— І сапраўды, успрыманне моды ў іх вельмі рознае. Для мужчын мода — гэта перш-наперш сексуальнасць. Ім на самай справе ўсё роўна — гэта мода стылістычная або масмаркет. Тым больш рэдкі мужчына можа правільна камбінаваць рэчы. Таму, працуючы з мужчынскім адзеннем, я разумею, што іх камплекты павінны быць завершанымі.

— Вы сказалі, што многае залежыць ад рэгіёна. Ці проста рабіць адзенне для беларусаў?

— Беларускіх мужчын апранаць вельмі складана *(смяецца)*. Ну вось, напрыклад, усім вядомыя тыдні моды. Падчас нашага, беларускага, тыдня моды адзінкі звяртаюцца, каб набыць нейкую рэч. У іншых краінах на падобных мерапрыемствах момантам залятаюць за кулісы людзі, яны мацаюць рэчы, просяць прымераць, спрабуюць дамовіцца. Людзям у Еўропе падабаецца мой стыль, ён дае магчымасць разняволіцца і расслабіцца. Нашы мужчыны мне здаюцца трошкі закамплексаванымі, быццам не давяраюць сваім уяўленням. Калі ў іх ёсць джынсы, яны не купляюць другія, бо не разумеюць, навошта.

Хоць цяпер у нас і няма дэфіцыту, як раней, калі кожная рэч даставалася з цяжкасцю. Ды і абароты адзення ў нашай краіне іншыя... Напрыклад, на Захадзе паляжала рэч месяц у краме — адзін кошт, паляжала другі — другі і гэтак далей. У нас такога няма! Павесілі рэч у краме, і будзе вісець яна гадамі па тым жа кошце.

Мне здаецца, што такія адносіны да свайго знешняга выгляду ў беларусаў выпрацаваныя пакаленнямі: вось маці набыла сыночку адзенне, адпрасавала і павесіла на крэсла, малы апрануў, і думаць не трэба, такая прыкладна схема пераходзіць і ў дарослае жыццё мужчыны. Але я ўсё ж спадзяюся, што паступова сітуацыя будзе мяняцца і беларускія мужчыны захочуць выбіраць сабе адзенне і станоўць ставіцца да гэтага з большай цікавасцю.

— Раскажыце пра сучасныя тэндэнцыі ў модзе мужчынскага адзення.

— Сёння на піку папулярнасці кроены і вязаны трыкатаж. Швэдры могуць быць двух тыпаў: павялічана-шырокія або ў духу 1970-х гадоў, калі шчыльна прылягаюць да фігуры, але тады іх лепей запраўляць у штаны.

Неад'емная частка мужчынскага гардэроба — футболкі з кроенага трыкатажу. Сёння яны інавацыйна прадстаўлены камбінацыяй з розных матэрыялаў і структур, напрыклад, такіх як бавоўна, сеткаваты трыкатаж, плашчовая тканіна, галантарэйныя стужкі і рыбаны па рукавах і ўнізе, — у духу васьмідзясятых гадоў.

Гэтак жа лічыцца модным і друкаваны малюнак. Пачынае набіраць абароты тэма гладкай і чыстай паверхні. Колер можа быць розны, але пажадана насычаны — хакі, тэракотавы, сіне-шэры ці чырвоны.

Таксама ў гэтым і будучым сезоне захоўваецца прысутнасць дзелавога стылю.

Можна яшчэ заўважыць у людзей павальнае захапленне малюнкам «клетка». Яна можа быць як статычнага, так і дынамічнага парадку. Напрыклад, усімі любімая клетка «арлекін» на камізэльках і кардыганах. Клетка як модны трэнд з шарсцяных і паўшарсцяных тканін перанесена на іншыя структуры, ў прыватнасці на плашчавыя, атласныя, віскозныя і трыкатажныя асновы.

Мужчынскі гардэроб немагчыма ўявіць без штаноў! Дык вось цяпер модная стылістыка 1930-х гадоў. Штаны такія вырабляюцца з завышанай лініяй таліі і больш аб'ёмныя ў зоне сцягна.

Што ж датычыцца класічных пінжакоў, то значны ўплыў аказвае ўсё тая ж мода трыццатых, калі ўсе мужчыны насілі цёмныя ў дробную палоску прамога крою двухбортныя пінжакі. Пасадка пінжакоў робіцца больш свабоднай.

Калі казаць пра дэмісезонную вопратку, то ў трэндзе двухбаковыя мадэлі з двух функцыянальных слаёў. Смелы дэкор у выглядзе шрыфтоў, настрачных стужак і сцяжкоў, аб'ёмных кішэняў і кантрасных аплікацый канчаткова замацаваўся на верхнім адзенні. Рэкамендую мужчынам звярнуць увагу на вопратку, даўжыня якой крыху вышэйшая ці ніжэйшая калена.

— На ваш погляд, якое адзенне можна смела набыць, каб быць упэўненым, што яно не выйдзе з моды?

— Я доўга думала над гэтым пытаннем. Можна прапанаваць касуху — гэта такая кароткая скураная куртка. Форма касухі застаецца стандартнай, класічнай на працягу ўсяго часу яе існавання. Ды і я сама кожны год пакідаю касуху ў сваёй калекцыі, магу толькі памяняць колеравае рашэнне. Увогуле лічу, што касуха — супер.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Беларусь памятае

ФІЛАСОФІЯ ТВОРЧАСЦІ ЛЕАНІДА ЛЕВІНА

Выстаўка «Леанід Левін. Філасофія творчасці» адкрылася ў фотадакументальнай экспазіцыі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Яна праходзіць у межах мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю з дня адкрыцця мемарыяльных комплексаў «Хатынь» і «Курган Славы».

Комплекс «Хатынь» набыў сусветную славу і стаў знакавым месцам і візітнай карткай Беларусі. Мемарыял аб'яднаў у сабе памяць пра жыхароў вёскі Хатынь, спаленых карнікамі ў сакавіку 1943 года, і жыхароў беларускіх вёсак, якія раздзялілі іх лёс. Творчая група аўтараў мемарыялу — архітэктары Леанід Левін, Юрый Градаў, Валянцін Занковіч і скульптар Сяргей Селіханаў — змаглі паказаць трагедыю ахвяр фашызму і ўсяго беларускага народа.

Леанід Левін — вядомы архітэктар, грамадскі дзеяч, Заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ленінскай прэміі камсамола, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэат многіх прэстыжных конкурсаў, акадэмік Міжнароднай і Беларускай акадэмій архітэктуры.

Творчасць Леаніда Левіна — шматгранная і шматпланавая. Яго імя шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Работы Леаніда Левіна, выкананыя ім асабіста і ў суаўтарстве з калегамі, даўно сталі сімвалам многіх беларускіх гарадоў. Гэта мемарыяльны комплекс «Прарыў» (1974-ы, у суаўтарстве з Юрыем Градавым і Анатолем Анікейчыкам), мемарыяльны комплекс «Пракляцце фашызму» ў памяць спаленых населеных пунктаў Докшыцкага раёна і вёскі Шунеўка (1983-і, у суаўтарстве з Юрыем Градавым і Анатолем Анікейчыкам), мемарыял «Шталаг-342» у Маладзечне (1990-ы), мемарыял ахвярам Халакоста «Яма» (2000-ы), мемарыяльны комплекс загінулым яўрэям Гарадзейскага гета, мемарыял дзецям —ахвярам вайны ў Красным Беразе Жлобінскага раёна і іншыя. Праект мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» ва ўрочышчы Благаўшчына, прадстаўлены ў 2013 годзе, быў рэалізаваны пасля смерці аўтара.

Леанід Левін — не толькі архітэктар, але і філосаф, гуманіст, майстар па стварэнні лаканічнай простай формы, якая выклікае ў той жа час пачуццё хвалявання і дасканаласці. Кожная яго работа прымушае задумацца пра месца чалавека на вайне і ў свеце, каштоўнасць жыцця.

На выстаўцы прадстаўлена невялікая частка творчай спадчыны архітэктара, якая ўключае работы розных гадоў — з канца 1960-га да 2014-га, макеты помнікаў, асабістыя рэчы. На выстаўцы прадугледжаны паказ дакументальнага фільма «Маналог», расказа Леаніда Левіна пра стварэнне сваіх работ. Наведвальнікаў суправаджаюць развагі пра кожны помнік.

Літаратурны талент Леаніда Левіна падарыў нам напоўненыя бясцэннымі ўспамінамі пра творчы пошук і перыпетыі лёсу кнігі «Хатынь» і «Перажыць перажытае», поўны напружанай глыбіні паэтычны зборнік «Імгненне», драму «Вайна і каханне». Хатынь назаўжды засталася для яго часцінкай жыцця. У сваіх успамінах Леанід Левін пісаў: «Зямны шар. Як гэта многа і як мала. Сёння для нас цэнтрам зямнога шара стала Хатынь. Гады творчасці, гады жыцця. Не адзін і не два аддалі мы гэтаму маленькаму кавалачку беларускай зямлі...»

Выстаўка падрыхтаваная дзяржаўнай установай «Гісторыка-мемарыяльны комплекс «Хатынь» сумесна з унітарным прадпрыемствам «Творчая майстэрня архітэктара Левіна Л. М.» і сям'ёй архітэктара.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Даты | Падзеі | Людзі

6 ЛІПЕНЯ

У краіне

1864 год — нарадзілася Аўфрасіння Міхайлаўна Гарэцкая, беларуская народная спявачка. Свабодна валодала рознымі стылямі выканання, спевам з «пералівамі» ў адпаведнасці з традыцыямі беларускага Падняпроўя. Яе рэпертуар складаўся пераважна з сямейна-абрадавых і каляндарных песень, сярод якіх асаблівай разнастайнасцю вылучаліся радзінныя, вясновыя, вясельныя, жніўныя песні. 318 тэкстаў з мелодыямі склалі асобную кнігу «Народныя песні з мелодыямі». Памерла ў 1935 годзе.

1894 год — нарадзіўся Ілья Сцяпанавіч Федасеенка, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1918-га ў Чырвонай Арміі, камандзір узвода, роты, батальёна, стралковай дывізіі. З 1940 года дырэктар Гомельскага аўтарамонтнага завода. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941-га да жніўня 1943-га камандзір партызанскага атрада «Бальшавік» Гомельскага партызанскага злучэння, член Гомельскага падпольнага гаркама КП(б) Б. За партызанскага камандзіра гітлераўцы абяцалі буйное ўзнагароджанне. У снежні 1943-га вярнуўся на Гомельскі аўтарамонтны завод. Памёр у 1947 годзе. Яго імем названа вуліца ў Гомелі.

1929 год — нарадзіўся Сяргей Іванавіч Яўдошанка, акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі (1963). У 1950 годзе скончыў Адэскае тэатральнае вучылішча, у 1975-м — рэжысёрскую лабараторыю пры Маскоўскім тэатры імя Маякоўскага. З 1955 года — акцёр і рэжысёр (у 1979—1981-м, 1993—1995 гадах — галоўны рэжысёр) Брэсцкага тэатра драмы і музыкі. Памёр у 2009 годзе.

У свеце

1859 год — нарадзіўся Карл Густаў Вернер фон Хейдэнстам, шведскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1916). Аўтар літаратурнага маніфеста неарамантызму «Рэнесанс», вершаў, апавяданняў. Памёр у 1940 годзе.

1919 год — нарадзіўся Барыс Ісакавіч Балтэр, пісьменнік, удзельнік савецка-фінскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Самы вядомы твор пісьменніка — аповесць «Да пабачэння, хлопчыкі», надрукаваная ў 1962 годзе ў часопісе «Юность», пазней перапрацаваная ў п'есу і экранізаваная рэжысёрам Міхаілам Калікам. Памёр у 1974 годзе.

1919 год — брытанскі дырыжабль R-34 прызямліўся ў Нью-Ёрку. Гэта першае паветранае судна, якое ўдала пераляцела Атлантычны акіян.

1946 год — нарадзіўся Сільвестр Сталоне, амерыканскі акцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст і прадзюсар. За сваю акцёрскую кар'еру зняўся больш чым у 50 фільмах. У снежні 2016-га прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прапанаваў Сталоне пасаду старшыні Нацыянальнага фонду мастацтваў і гуманітарных навук, ад якой той адмовіўся.

1973 год — англійскі гурт Queen выпусціў свой першы сінгл Keep Yourself Alive. Ён выйшаў у фармаце 7'' пласцінкі ў 14 краінах.

1994 год — парламент Казахстана прыняў рашэнне аб пераносе сталіцы рэспублікі з Алма-Аты ў Акмалу (з 1998 года — Астана). У ліпені 1999 года новая сталіца Казахстана была ўдастоена прэміі ЮНЕСКА «Горад свету». Сёлета ў сакавіку Астана перайменавана ў Нур-Султан.

СЁННЯ

Месяц

Маладзік 2 ліпеня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Соф'і, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Георгія, Германа, Дзяніса, Сямёна, Фёдара.*
К. *Дамінікі, Люцыі, Тэрэзы, Эдварда.*

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.46	21.42	16.56
Віцебск	4.27	21.40	17.13
Магілёў	4.36	21.32	16.56
Гомель	4.42	21.20	16.38
Гродна	5.03	21.56	16.53
Брэст	5.13	21.47	16.34

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Падары ёй пярсцёнак. Каб усе бачылі, што яна занятая.

— Я лепш сам заўсёды побач буду: гэта больш надзейна.

Форум медыкаў.

«Нарэзанае мяса кладзеш на патэльню, смажыш, дзесьці паміж другой і трэцяй ступенню апёку дадаеш гародніну».

У бухгалтэрыі:

— Як думаеш, грошы, выдаткаваныя на корм сабакам, лагічна спісаць на артыкул «Ахоўная і пажарная сігналізацыя»?..

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2335.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2019 года.